Запаведнік яго надзеі

“Ведай, Беларусь, ты чароўная!” — сцвярджае з дапамогай сваіх твораў вядомы беларускі фотамастак Вячаслаў АЛЕШКА.

Каля сямі дзесяткаў цудоўных фатаграфічных карцін на па-латне расквецілі падчас экалагічнага свята залы Гродзенскага музея гісторыі рэлігіі. Наведвальнікау сустракаў сам аўтар — Вячаслаў Апешка. Яго выстава замяла своеасаблівую “мастацкую” нішу ў страката-багатай праграме экалагічнага форуму. Завіталі сюды і высокія госці.

Віншавалі майстра ме толькі з нагоды адкрыцця цудоўнай экспазіцыі. У гэты ж дзень ва ўрачыстай абстаноўцы яму ўручылі нагрудны знак “Ганаровы эколаг” — у ліку першых у гісторыі новай узнагароды, зацверджанай Прэзідэнтам краіны ў гэтым годзе.

Дарэчы, і сам Алешка зрабіў міністэрству-юбіляру падарунак — калекцыю сваіх фатаграфічных карцін. А яго выстава адправіцца ў “зялёнае” падарожжа па Беларусі — каб расказаць усім-усім, як моцна можна любіць сваю Радзіму і якая яна прыгожая! І давесці да кожнай душы, што менавіта родная зямля з яе чароўнай прыродай і ёсць той запаведны кут, які ўсім нам дадзекы, каб ушанаваць яго і на гэтай планеце, і ў сваіх сэрцах.

"Беларусь запаведная"..- Так назваў сваю выставу аўтар нездарма. Бо відаць, вельмі ясна відаць, што родная Беларусь для Вячаслава Алешкі — гэта і ёсць запаведнік яго надзеі, яго і мінулае, і будучае, і шчасліва-творчы сённяшні дзень.

Святлана БУШЧЫК, "НГ"

Источник: Народная газета.-2010.-8 вер.(№ 170).-С.12.